ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па выхаваўчай
працы УА “БрДУ імя А.С. Пушкіна”
________________ Т.В. Сакалова
«___» ____________ 2023 г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан філалагічнага факультэта
УА “БрДУ імя А.С. Пушкіна”
__________ Т.В. Сянькевіч
«02» ____10____ 2023 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ УНІВЕРСІТЭЦКІМ ФОТАКОНКУРСЕ “ПЕРШАЦВЕТ”

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Фотаконкурс “Першацвет” з’яўляецца **адкрытым**, у ім могуць прыняць удзел студэнты розных факультэтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, вучні 9–11 класаў агульнаадукацыйных устаноў Брэсцкай вобласці.

## АРГАНІЗАТАР ФОТАКОНКУРСУ

**Арганізатарамі** ўніверсітэцкага фотаконкурсу “Першацвет” з’яўляюцца кафедра рускай літаратуры і журналістыкі філалагічнага факультэта, аддзел выхаваўчай працы з моладдзю установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”.

## АРГКАМІТЭТ ФОТАКОНКУРСУ

1. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры рускай літаратуры і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Клундук С.С. – дацэнт кафедры рускай літаратуры і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Кавальчук В.М. – дацэнт кафедры рускай літаратуры і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
4. Кошык Т.М. – начальнік аддзела выхаваўчай працы з моладдзю.

## МЭТА І ЗАДАЧЫ ФОТАКОНКУРСУ

**Мэты і задачы** фотаконкурсу – актуалізаваць цікавасць моладзі (вучняў і студэнтаў) да фотажурналістыкі як вобласці творчай дзейнасці.

## УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ФОТАКОНКУРСУ

Фотаконкурс праводзіцца ў 2 этапы:

1. першы этап – “Памяць зямлі беларускай” – з 23.10.2023 г. па 03.11.2023 г.;
2. другі этап – “Берасцейшчына незвычайная” – з 02.05.2024 г. па 13.05.2024 г.

Для ўдзелу ў **першым** этапе фотаконкурсу **да 23 кастрычніка 2023 года** неабходна даслаць:

1. **заяўку** на электронны адрас куратара фотаконкурсу (ssklunduk@mail.ru), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (форма заяўкі прыкладваецца, гл. дадатак 1) і назву конкурснай працы (прац);
2. **1–2 фотаздымкі:**

– у лічбавым варыянце на электронны адрас куратара фотаконкурсу (ssklunduk@mail.ru);

– у раздрукаваным варыянце фармату А4 на адрас: 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28; каб. 311 вучэбнага корпуса № 2).

Для ўдзелу ў **другім** этапе фотаконкурсу **да 2 мая 2024 года** неабходна даслаць:

1. **заяўку** на электронны адрас куратара фотаконкурсу (ssklunduk@mail.ru), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (форма заяўкі прыкладваецца, гл. дадатак 1) і назву конкурснай працы (прац);
2. **1–2 фотаздымкі:**

– у лічбавым варыянце на электронны адрас куратара фотаконкурсу (ssklunduk@mail.ru);

– у раздрукаваным варыянце фармату А4 на адрас: 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28; каб. 311 вучэбнага корпуса № 2).

## ПАТРАБАВАННІ ДА КОНКУРСНЫХ ФОТАЗДЫМКАЎ

1. Фотаздымкі павінны адпавядаць тэматыцы конкурсу.
2. Лічбавы варыянт фотаздымкаў павінен быць ў фармаце JPEG.
3. Памер лічбавага варыянту здымка не павінен перавышаць 5 Мб.
4. Фотаздымкі могуць быць каляровымі і чорна-белымі.
5. Назва электроннага файла з фотаздымкам павінна ўключаць прозвішча, імя ўдзельніка і скарочаны варыянт назвы школы (узор: Іваноў Іван СШ 24 г. Брэста);
6. Раздрукаваныя фотаздымкі падпісваюцца на адваротным баку (ці на невялікай картцы, якая прымацоўваецца да фотаздымка) з указаннем:

– прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара,

– поўнай (афіцыйнай) назвы навучальнай ўстановы,

– класа,

– назвы конкурснай працы.

Да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца:

– фотаздымкі, адпраўленыя пасля ўказанай у Палажэнні даты прыёму прац;

– фотаздымкі без належна аформленай заяўкі;

– фотамантаж, фотакалаж з выкарыстаннем камп’ютарнай графікі;

– размытыя, відавочна няякасныя фота;

– фотаздымкі, якія супярэчаць нормам маралі;
– чужыя фотаздымкі (цалкам або часткова); узятыя са знешніх крыніц.

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ КОНКУРСНЫХ ПРАЦ

Крытэрыямі для ацэнкі конкурсных прац з’яўляюцца:

– адпаведнасць зададзенай тэме і яе раскрыццё;
– арыгінальнасць сюжэту;
– інфармацыйная змястоўнасць;
– якасць фатаграфіі (фокус, баланс святлаценю, кампазіцыя і т.п.).

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ФОТАКОНКУРСУ

З 26.10.2023 г. па 03.11.2023 г. у аўдыторыі 322 філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна (вул. Міцкевіча, 28, вучэбны корпус № 2, 3 паверх) будзе працаваць выстава дасланых прац **першага** этапу фотаконкурсу. Вынікі першага этапу фотаконкурсу падводзяцца з 04.11.2023 г. па 10.11.2023 г.

З 05.05.2024 г. па 13.05.2024 г. у аўдыторыі 322 філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна (вул. Міцкевіча, 28, вучэбны корпус № 2, 3 паверх) будзе працаваць выстава дасланых прац **другога** этапу фотаконкурсу. Вынікі другога этапу фотаконкурсу падводзяцца з 14.05.2024 г. па 20.05.2024 г.

Пераможцы **першага** этапу фотаконкурсу (па запрашэнні аргкамітэта) узнагароджваюцца дыпломамі (па рашэнні аргкамітэта могуць быць заменены на электронны варыянт).

Пераможцы **другога** этапу фотаконкурсу (па запрашэнні аргкамітэта) узнагароджваюцца дыпломамі (па рашэнні аргкамітэта могуць быць заменены на электронны варыянт).

## КАНТАКТЫ

Адрас: ssklunduk@mail.ru (куратар фотаконкурсу).

Кантактныя тэлефоны: + 8 (016) 21 63 92 – кафедра рускай літаратуры і журналістыкі; + 375 29 724 30 85 – Клундук Святлана Сяргееўна – дацэнт кафедры рускай літаратуры і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Дадатак 1.**

**Заяўка на ўдзел**

*(заяўку запаўняць дакладна і строга па патрабаваннях; указваць рэальныя электронныя адрасы пошты, паколькі на іх будзе высылацца інфармацыя па выніках конкурсу)*

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка (**на беларускай мове**) | |
| ФИО участника (**на русском языке**) | |
| **Поўная афіцыйная** назва ўстановы адукацыі (**на беларускай мове**) | |
| **Полное официальное** название учреждения образования **(на русском языке)** | |
| Факультэт, група, клас | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку, месца працы, пасада кіраўніка (на беларускай мове) | |
| ФИО, место работы, должность руководителя (на русском языке) | |
| Назва конкурснай працы | |
| Кантактныя тэлефоны ўдзельніка | |
| **E-mail удзельніка ці прадстаўніка ўдзельніка** | |